*К.А. Дзічкоўская*

# КАНЦЭПТ «СЯМ'Я» Ў ІТАЛЬЯНСКАЙ КУЛЬТУРЫ 50– 60-Х ГГ. ХХ СТ.

Канцэпты ўяўляюць сабой глыбінныя праграмы сацыяльнай жыццядзейнасці, арганізуючы элементы культуры ў цэласную сістэму. Гэтыя асновы культуры вызначаюць тып грамадства і яго карціну свету, складаюць светапогляд адпаведнай гістарычнай эпохі. Канцэпт выступав як крайне абагульненая сістэма светапоглядных уяўленняў і ўстановак, якія фарміруюць цэласны вобраз чалавечага свету. Канцэпты з'яўляюцца базіснай структурай чалавечай свядомасці, іх сэнсы вызначаюць катэгарыяльны лад свядомасці ў кожную канкрэтную гістарычную эпоху.

Пры даследаванні аспектаў культуры выдзяляюць семіётыку канцэптаў як найбольш структураваную частку семіётыкі культуры, валодаючай уласным апаратам даследавання. У выніку паняцце «канцэпт» стала адным з папулярных і асноўных элементаў метадалагічнага дыскурсу.

Культурныя канцэпты дазваляюць рэканструяваць і апісваць пэўную карціну свету. Метадалагічная значнасць рэканструкцыі той ці іншай карціны свету заключаецца ў магчымасці фарміравання цэласнага, маштабнага погляду на даследуемую культуру. Супастаўляльны аналіз вывучаемай культуры з іншымі культурамі на аснове канцэптаў дае магчымасць тыпалагізаваць вывучаемую з'яву на аснове адзіных крытэрыяў і сістэм прыкмет, аднолькава прымяняемых да тыпалагізацыі любой іншай культуры.

Мэта артыкула – рэканструяваць канцэпт «сям'я» ў італьянскай культуры 50–60-х гг. ХХ ст.

Адданасць італьянцаў сям'і – вось адна з самых вядомых у свеце нацыянальных рыс італьянскага народа. Італьянцы сапраўды славяцца сваёй прыхільнасцю да сямейных каштоўнасцей.

Перыяд заканчэння Другой сусветнай вайны характарызуецца адраджэннем сямейных каштоўнасцей і арыенціраў, падвергнутых значным выпрабаванням падчас вайны. Важную ролю ў гэтым адыграла царква. На палітычнай арэне Хрысціянска-дэмакратычная партыя стала носьбітам ідэі аб неабходнасці аздараўлення і паляпшэння нораваў сям'і [1]. Сярэднія слаі насельніцтва падтрымалі гэтую фармулёўку, што паўплывала на пазітыўныя вынікі, дасягнутыя Хрысціянска-дэмакратычнай партыяй на першых выбарах. Фармуліроўка артыкулаў канстытуцыі 30 [2] і 31 [3] выклікала асаблівы інтарэс і ажыўленыя дэбаты на ўстаноўчым сходзе [4]. У выніку было дасягнута пагадненне адносна дадзеных артыкулаў, прадугледжваючае наступнае: сям'я з'яўляецца натуральным аб'яднаннем, у якім прызнаецца раўнапраўе мужа і жонкі і пры гэтым гарантуецца пэўная юрыдычная і сацыяльная абарона незаконнанароджаных дзяцей. Развод не прызнаваўся ні царквой, ні дзяржавай.

Менавіта шлюб працягваў заставацца асноўным паказчыкам для стварэння сям'і. У пасляваенны перыяд было зарэгістравана мноства шлюбаў, якія па розных зразумелых матывах не маглі быць афармлены ў ваенны перыяд. З сярэдзіны 40 і да пачатку 70-х гг. прыблізна 98 % шлюбаў былі заключаны ў адпаведнасці з рэлігійным абрадам у царкве [5]. Шлюб і сям'я характарызуюцца трыва-ласцю і надзейнасцю народнай маралі. Такія сямейныя каштоўнасці, як цнота, гонар, роз-ныя адносіны да здрады, здзейсненай жонкай ці мужам, – гэта ўсё індыкатары грамадства, карані якога знаходзяцца ў глыбокім мінулым. Гаворка ідзе аб сям'і, якая складаецца з чатырох членаў у адпаведнасці з перапісам 1951 г., гэта велічыня скарацілася да 3,6 падчас наступнага перапісу 1961 г. [6].

Трэба заўважыць, што 60-я гг. ХХ ст. характарызуюцца эканамічным бумам, суправаджаемым высокай нараджальнасцю, апагей якой прыходзіцца на 1964 г. (19,5 %). Такое анамальнае павелічэнне было зарэгістравана ў 1964 г., калі на 417486 шлюбаў прыходзілася 1016120 нараджальнасцей [7]. Гэты працэс на ўсёй тэрыторыі краіны быў

нераўнамер-ным: інтэнсіўнасць яго назіралася ў паўночных і цэнтральных абласцях, якія гістарычна заўсёды мелі меншы працэнт нараджальнасці ў параўнанні з паўднёвымі абласцямі краі-ны. Але, нягледзячы на гэты факт, Італія ўсё яшчэ застаецца еўрапейскай краінай з нізкай нараджальнасцю, уступаючы месца Францы, Вялікабрытаніі, краінам Бенілюкс, Іспаніі, Партугаліі і Ірландыі. Нават максімум нара джальнасці, дасягнуты Італіяй у 1964 г. (2,7 % нараджальнасці на жанчыну), з'яўляецца ніжэй .максімуму, дасягнутага ў краінах Бенілюкс у 1961 г. (3,2 %), а таксама ў Францыі і Вялікабрытаніі ў 1964 г. (2,9 %) [8].

Нягледзячы на сацыяльныя зрухі, змяненні і перавароты дадзенага перыяду, сям'я абараняе ад знешняга свету і дае прытулак. Уклад жыцця народа цвёрда трымаецца на сямейнай адзінцы. Сацыяльная згуртаванасць засталася нязменнай, нягледзячы на шматлікія культурныя адрозненні ўнутры краіны, дзякуючы дзейснаму аб'ядноўваючаму сродку. У італьянскіх класічных фільмах больш не ствараецца вобраз чарады крыклівых дзяцей, якія жывуць у адным цесным пакойчыку шматкватэрнага дома ў адным з найбяднейшых раёнаў Неапаля, з л'яным бацькам, вяртаючымся позняй ноччу, і маці ў чорным, чакаючай у кутку пакоя яго прыходу. Безумоўна, інстытут сям'і зведаў значныя змяненні, але сямейныя вузы вельмі важныя, а яе цэнтральнае становішча нязменнае.

І хоць большую частку свайго жыцця італьянцы праводзяць за межамі дома, сямейны дом – гэта форум, на якім збіраюцца ўсе яго члены. Калі англа-саксонскі канцэпт дома цесна звязаны з інтарэсам індывідуума і часта не залежыць ад увагі сям'і (*the Englishman's home is his castle*; *setting up a home of one's own*), то італьянскі канцэпт дома непарыўны з ідэяй сям'і. Таму ў італьянскай культуры паняцці «дом» і «сям'я» з'яўляюцца сінонімамі і як канцэпты дапаўняюць адно аднаго.

Разгледзім канцэпт «сям'я» ў двух сэнсах: у вузкім і шырокім.

У вузкім сэнсе сям'я складаецца з бацькі, маці, сыноў і дачок. У сям'і вяршэнствуе жанчына. Культ маці даволі значны для італьянскага грамадства. Ён выклікае цікавы феномен, калі мужчына важны ў якасці сына, а не бацькі, у той час як жанчына важна толькі ў якасці маці, а не дачкі. Менавіта жанчына павінна ахвяраваць працай, асабістымі задавальненнямі, якія яна атрымлівае па-за сям'ёй, у імя сям'і, шлюбу, мужа і дзяцей. Ідэя аб тым, што муж таксама павінен выконваць хатнія абавязкі, яшчэ непрымальная для Італіі. Італьянскіх мужчын часам абвінавачваюць у залішне моцнай прыхільнасці да бацькоўскага дома, асабліва да маці, якую яны паважаюць і чыімі парадамі карыстаюцца аж да старасці. Але пры гэтым нельга не адзначыць і той факт, што большасць італьянцаў не толькі добрыя сыны, але і выдатныя мужы і бацькі, якія клапоцяцца аб сям'і і асабліва аб дзецях, шмат працуюць, каб забяспечыць сваёй сям'і належны спосаб жыцця. Сапраўды, сыноў звычайна песцяць з дзяцінства. «*Mammone*» – слова з італьянскага слоўніка, выкарыстоўваемае ў адносінах да маладых і не вельмі маладых мужчын, залішне адданых маці. Мамчыны сынкі, а менавіта так можна перакласці гэтае слова, рэдка пакідаюць бацькоўскае гняздо, а калі пакідаюць, то перабіраюцца ў дом праз дарогу ці па суседстве. Адносіны паміж маці і сынам вельмі важныя, бо ўяўляюць сабой эмацыянальна клейкае рэчыва сям'і.

І тут трэба выдзеліць і адзначыць спецыфічную асаблівасць звычаю – працяглае знаходжанне ўжо дарослых у сям'і. Гэты феномен носіць гістарычны характар. Справа ў тым, што, з аднаго боку, італьянскія бацькі не чакаюць ні за што платы, а з другога – самі дзеці, нават калі працуюць, не вельмі ўдзельнічаюць у складанні сямейнага бюджэту.

Вельмі часта італьянская сям'я ўяўляе сінтэз некалькіх сем'яў, якія належаць да розных пакаленняў, пражываючых пад адным дахам. Як правіла, гэта сям'я, якая пражывае ў двухпавярховым доме: першы паверх заняты бабуляй і дзядулем, а на другім паверсе знаходзяцца ўсе астатнія. Адзначым адрозненне паміж канцэптам «дом» у італьянскай і англа-саксонскай культурах: для англічан важны свой, хоць зусім і невялікі, але асобны дом часам з маленькім садам, у той час як для італьянцаў важна месца, якое будзе для іх

вельмі каштоўным і да якога яны адчуваюць прыхільнасць, а праблема шуму і адасобленасці ім невядома.

Адсутнасць і неэфектыўнасць дашкольнай сістэмы – вось адна з прычын, чаму дзядулі і бабулі выконваюць важную ролю ў італьянскай сям'і. Менавіта яны гадуюць і выхоўваюць унукаў, калі бацькі працуюць. Адносіны да дзяцей у італьянцаў асаблівыя, адрозныя ад многіх народаў. Дзеці, якія адчуваюць увагу бацькоў, бабуль і знаёмых, – амаль уласнасць публікі. Італьянцы вельмі цярпімыя да дзяцей, нават самых непаслухмяных і некіруемых. Брытанскія ці амерыканскія сем'і выглядалі б ашаломленымі, калі б іх дзіця пачало голасна капрызнічаць ці плакаць у рэстаране ці музеі. Італьянцы ж натоўпам абкружылі б каляску з дзіцем, спрабуючы яго пагладзіць, патрымаць за ручку ці паказытаць яму ножкі. Няважна, з якой сям'і дзіця, багатай ці беднай, яно – кароль [9]. Італьянскія бацькі лёгка, без асаблівых праблем прымаюць жвавасць і крыкі дзяцей. Да дзяцей адносяцца як да асоб, якія не менш важныя, чым дарослыя. Вось чаму італьянскім дзецям дазволена ўсё. Дзяцей апранаюць, як дарослых у мініяцюры, іх знаёмяць з усімі аспектам" існуючай рэчаіснасці, іх водзяць у рэстараны, яны з'яўляюцца ўдзельнікамі ўсіх сямейных падзей.

Сям'я ў шырокім сэнсе – гэта распаўсюджаная адзінка грамадства, якая ўключае ўсю радню, усіх дзядзькаў і цётак featured рознай аддаленасці ў роднасці. Яна збіраецца на ўсіх значных падзеях: вяселлі, хрышчэнні, першай прычасці, пахаваннях. Менавіта тут перад шматлікай раднёй італьянец можа і павінен паказаць свой прэстыж.

Сям'я забяспечвае сетку самых глыбокіх і важных узаемаадносін у італьянскім грамадстве. Праўда, тое ж самае можа быць сказана аб любым іншым грамадстве, аднак у Італіі сям'я мае вялікі ўплыў і ўладу над вернасцю і адданасцю яе членаў. Узаемасувязь унутры сям'і трывалая. Яна непадуладна эвалюцыі іншых норм паводзін, вось чаму яна па праву ўяўляе асноўны блок грамадства. Сям'я – галоўны дэтэрмінант менталітэту італьянцаў.

Доказам можа паслужыць прыклад таго, што вельмі многія італьянскія прыватныя фірмы складаюцца толькі з членаў сем'яў, асабліва гэта выражана ў сферы малога бізнесу (магазіны, пральні, цырульні) і ў кампаніях, працуючых з дастаткова канфідэнцыяльнай інфармацыяй (бухгалтарскія, натарыяльныя, адвакацкія фірмы). Аднак у сферы буйнога бізнесу сямейнасць таксама знаходзіць сваё адлюстраванне. Дарэчы, знакамітая італьянская мафія будавалася таксама на прынцыпе сямейнасці, калі ступень даверу была высокай, а ўсе праблемы вырашаліся ў сямейным коле і можна было не хвалявацца за тое, што інфармацыя аб справах прасочыцца.

Для таго каб абмеркаваць сямейныя праблемы, падтрымаць цесныя адносіны паміж сваякамі, італьянцы практыкуюць (на поўдні краіны больш, а на поўначы Італіі менш) вялікія сямейныя абеды ў выхадны дзень у доме аднаго са сваякоў. На такія абеды збіраецца часам да 20–30 чалавек, сумесна купляюцца прадукты, гатуецца абед І падчас усёй гэтай сустрэчы адбываецца гутарка, высняецца, як і чым жыў за перыяд часу з дня апошняй сустрэчы. Падчас жа самога абеду абмяркоўваюцца, як правіла, праблемы больш сур'ёзныя. Безумоўна, у гэтых вялікіх сем'ях не абыходзіцца і без плётак і некаторых канфліктаў, аднак характэрнай рысай з'яўляецца тое, што ўсе інтрыгі і супярэчнасці застаюцца ў сямейным асяроддзі і за яго межы не выходзяць (*I panni sudici si lavano in famiglia.* — Брудную бялізну мыюць дома; не вынасі смецце з хаты).

Трываласць сямейных вуз — галоўная крыніца эканамічнага поспеху краіны. Адным з прыкладаў могуць паслужыць сямейныя кампаніі малога і сярэдняга памеру. Гэтыя прадпрыемствы квітнеюць, нягледзячы на неэфектыўны ўрад, прафсаюзы і непасільныя падаткі, бо кроўныя вузы гарантуюць сумленнасць і прадбачлівасць падчас буму, а таксама здольнасць хутчэй аднаўляць фізічныя і духоўныя сілы пасля складаных перыядаў.

Калі італьянец багаты і шчаслівы або здаецца такім, то прычыну гэтага трэба шукаць не ў моцных незалежных інстытутах, не ў мудрых урадах, не ў надзейнай інвестыцыйнай

палітыцы ці забеспячэнні шчодрага сацыяльнага абслугоўвання, а ў сям'і. Менавіта сям'я ўяўляе сабой бацькоў эканамічнага поспеху. Можна лёгка заўважыць, што кіраванне і кантроль у многіх паспяховых прадпрыемствах падпарадкаваны адной сям'і, як, напрыклад, сям'і Анэлі (Agnelli), якія з пакалення ў пакаленне перадаюць кантроль над «Фіят». Аднак існуе думка, адрозная ад вышэйузгаданай, што вялікае ці маленькае прадпрыемства, кіруемае на сямейным узроўні, са сваім канцэптам лаяльнасці і сумленнасці, даўно састарэла ў сучасным свеце бізнесу.

Трэба заўважыць, што большая частка паспяховых прадпрыемстваў сканцэнтравана на поўначы краіны, аднак на ўсім паўвостраве знаходзіцца вялікая колькасць маленькіх прадпрыемстваў, кіруемых унутры сям'і, нават калі гаворка ідзе аб незвычайным родзе дзейнасці. На поўдні таксама добра развіты індустрыяльныя сямейныя прадпрыемствы, як і на поўначы, але звязаны яны больш з сельскай гаспадаркай, нелегальнай дзейнасцю ў вялікім маштабе ці з «магчымасцю распараджацца» дзяржаўнымі дапамогамі і субсідыямі [10].

І яшчэ адна вельмі важная асаблівасць італьянскай сям'і: быць прадстаўленым сям'і лічыцца вялікім гонарам і прыкметай пэўнай да Вас увагі. Гэта значыць, што Вы цяпер свой.

Італьянскае грамадства засноўваецца галоўным чынам на групах невялікіх памераў (сем'ях) ці на адносінах сямейнага тыпу, таму можна сцвярджаць, што Італія не аднародная, а ўяўляе сабой хутчэй архіпелаг, які складаецца з сем'яў. Сям'я – па ўсіх паказчыках самая галоўная і магутная адзінка грамадства. Самае каштоўнае, чым можа пахваліцца як багач, так і бядняк, – гэта ўласная сям'я. Менавіта адзінствам сям'і моцнае італьянскае грамадства [11]. Стабільнасць і раўнавага як адзінкі, якія бяруць пачатак у сямейным асяроддзі, – адзінае тлумачэнне поспеху такой неаднароднай, гетэрагеннай нацыі ў захаванні культурнай цэласнасці і адзінства, а таксама палітычнай стабільнасці, нягледзячы на вялікую колькасць змяняючых адзін аднаго ўрадаў у пасляваенны перыяд.

*ЛІТАРАТУРА*:


1. *Ginsborg P.* Storia d'Italia dal dopoquerra ad oggi. Societa' e politica 1943—1988. Torino, Einaudi, 1989. 99 p.
2. Артыкул 30 — E' dovere e diritto dei genitori mantenere, istruire ed educare i figli, anche se nati fuori del matrimonio. Nei casi di incapacita' dei genitori, la legge provvede a che siano assolti i loro compiti. La legge assicura ai figli nati fuori del matrimonio ogni tutela giuridica e sociale, compatibile con i diritti dei membri della famglia legittima. La legge detta le norme e i limiti per la ricerca della paternita'.
3. Артыкул 31 — La Repubblica agevola con misure economiche e altre provvidenze la formazione della famiglia e I'adempimento dei compiti relativi, con particolare riguardo alle famiglie numerose. Protegge la maternita', I'infanzia e la gioventu', favorendo gli istituti necessari a tale scopo.
4. Асноўная інфармацыя аб устаноўчым сходзе па тэме «Сям'я»: Sarogni E. La donna italiana. II lungo cammino verso i diritti. Parma, Pratiche Editrice, 1995. 151 p.
5. Stefano Baldi, Raimondo Cagiano de Azevedo «La popolazione italiana. Storia demografica dal dopoguerra ad oggi» — Universale paperbacks il Mulino, Bologna, Seconda edizione, 2000. P. 34.
6. ISTAT — Цэнтральнае статыстычнае бюро.
7. ISTAT — Цэнтральнае статыстычнае бюро.
8. V. Terra Abrami e M. P. Sorvillo. Le mithe de la fecondite italienne, in INED, L'etat des connaissances, Paris, Editions La Decouverte, 1996. P. 118—119.
9. *Matt Frei.* The Unfinished Revolution. Sinclair-Stevenson, 1996. 113 p.
10. *John Haycraft.* Italian Labyrinth. Seeker & Warburg, 1985. 124 p.
11. *Charles Richards.* The new Italians. Penguin, 1995. 126 p.

12. *Ginsborg P.* Storia d'ltalia dal dopoquerra ad oggi. Societa' politica 1943—1988. Torino, Einaudi, 1989.
13. *Romano S.* Storia d'ltalia dal risorgimento ai nostri giorni. Milano, Mondadori, 1978.
14. *E. Di Nolfo.* La Repubblica delle speranze e degli inganni. Firenze, Ponte alleGrazie, 1996.

SUMMARY

The author reconstructs the concept «family» in the Italian culture of 50—60s of the last century. The reconstruction is based on compared method of family relationship in Italy and other countries. The family is considered to be one of the main determiners of Italian mentality.